373.5.016
К 193

ОБЯЗАТЕЛЬНЫЙ
ЭКЗЕМПЛЯР

Установа адукацыі
"Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.С. Пушкіна"

# КАНЦЭПТУАЛЬНЫЯ ПАДЫХОДЫ ДА РЭАЛІЗАЦЫІ ЗМЕСТУ ФІЛАЛАГІЧНАЙ АДУКАЦЫІ Ў ШКОЛЕ І ВНУ

Зборнік матэрыялаў
рэспубліканскай навуковай канферэнцыі

Брэст, 5 красавіка 2011 года

КХН

БИБЛИОТЕКА
БГУ
2056675 и

Фундаментальная библиотека
БГУ
00507747

Репозиторий БарГУ

Брэст
БрДУ імя А.С. Пушкіна
2013

УДК 372.881.046.14/.16(043.2)
ББК 74.268.1+74.56
К 19

*Рэкамендавана рэдакцыйна-выдавецкім саветам установы адукацыі «Брэсцкі дзяржаўны універсітэт імя А.С. Пушкіна»*

*Рэцэнзенты:*
кандыдат філалагічных навук, дацэнт **Г.В. Пісарук**
кандыдат філалагічных навук, дацэнт **Н.М. Борсук**

*Рэдакцыйная калегія:*
кандыдат філалагічных навук, дацэнт **У.А. Сенькавец**
доктар філалагічных навук, прафесар **І.А. Швед**
кандыдат філалагічных навук, дацэнт **В.М. Смаль**
кандыдат філалагічных навук, дацэнт **М.І. Янііцкі**

*Пад агульнай рэдакцыяй*
кандыдата філалагічных навук, дацэнта **У.А. Сенькаўца**

К 19 **Канцэптуальныя падыходы** да рэалізацыі зместу філалагічнай адукацыі ў школе і ВНУ : зб. матэрыялаў рэсп. навуковай канф., Брэст, 5 красавіка 2011 г. / рэдкал.: У.А. Сенькавец [і інш.] ; пад агульнай рэд. У.А. Сенькаўца ; Брэсц. дзярж. ун-т імя А.С. Пушкіна. – Брэст : БрДУ, 2013. – 226 с.
ISBN 978-985-473-991-5.

У зборнік уключаны артыкулы па тэарэтыка-метадычным асэнсаванні і практычнай рэалізацыі сучасных канцэптуальных падыходаў да выкладання літаратуры ў агульнаадукацыйнай школе і на філалагічных, гуманітарных факультэтах універсітэтаў Беларусі..

Прызначаны выкладчыкам, навукоўцам, настаўнікам, студэнтам, магістрантам, аспірантам.

Адказнасць за моўнае афармленне і змест артыкулаў нясуць аўтары.

УДК 372.881.046.14/.16(043.2)
ББК 74.268.1+74.56

КХН

ISBN 978-985-473-991-5

© УА «Брэсцкі дзяржаўны універсітэт імя А.С. Пушкіна», 2013

Рэпазіторый БарГУ

# ЗМЕСТ

*Адамовіч Г.Я.* Сістэмны аналіз як актуальная парадыгма міждысцыплінарных даследаванняў....................3
*Белая А.І.* Антрапалагічна арыентаваныя веды і праблема інтэрпрэтацыі мастацкага твора....................8
*Борсук Н.Н.* Роль литературы в адаптации туркменских слушателей........14
*Бут-Гусаім С.Ф., Цецярук Н.М.* Арганізацыя заняткаў школьнага антрапанімічнага гуртка "Таямніцы беларускага іменаслову"....................19
*Васюк Г.В.* "Сатурналии" Макробия....................24
*Ваўчок Г.І.* Фарміраванне пунктуацыйных уменняў пры вывучэнні складанага сказа....................29
*Воран І.А.* Вобраз гор у нацыянальнай мадэлі свету (на матэрыяле украінскай малой прозы пачатку XX стагоддзя)....................34
*Гоўзіч І.М.* Актуальныя праблемы вывучэння сучаснай беларускай паэзіі ў агульнаадукацыйных установах і ВНУ....................39
*Гурына Н.М.* Гісторыя і сучаснасць у аповесцях А. Наварыча І А. Федарэнкі для падлеткаў....................45
*Дамброўская Н.М.* Агульначалавечыя каштоўнасці і нацыянальны менталітэт у прозе пісьменнікаў-"шасцідзесятнікаў"....................51
*Жигалова М.П.* Информационные технологии в теории и практике высшей школы (на примере курса "Методика преподавания русской литературы")....................55
*Інак Мікалай (Алег Бембель).* Роднае слова і маральна-эстэтычны прагрэс....................66
*Ішчанка Г.М.* Вывучэнне манаграфічнай тэмы "Ніл Гілевіч" у 11 класе...70
*Кавалюк А.С.* Вывучэнне "Палескай хронікі" Івана Мележа ў школе........76
*Касцючык В.М.* Вывучэнне дыялектнай лексікі і фразеалогіі на занятках у ВНУ....................84
*Каяла У.І.* Патрыятызм і гуманізм прадмоў да "Юдзіф" і "Прытчаў Саламона" Францыска Скарыны....................89
*Королевич С.А.* Применение алгоритмов при изучении истории звуков русского языка....................93
*Куліковіч У.І., Прыгожая В.А.* Словаразмяшчэнне ў сучаснай беларускай мове як адна з прычын сінтаксічнай аманіміі....................99
*Лебядзевіч Д.М.* Станаўленне рыторыкі і моўная практыка грэка-рымскай антычнасці....................103
*Лугоўскі А.І.* Уклад Максіма Гарэцкага ў станаўленне методыкі выкладання беларускай літаратуры....................108
*Макарэвіч К.Т.* Вывучэнне творчасці Раісы Баравіковай у XI класе агульнаадукацыйных устаноў....................112
*Мароз К.М.* Рэлігійна-філасофскі кірунак у айчыннай паэзіі....................118

Репозиторий БарГУ

СПІС ЛІТАРАТУРЫ
1 Адамович, А.М. Додумывать до конца: Литература и тревоги века / А.М. Адамович. – М. : Сов. писатель, 1988. – 492 с.
2 Багдановіч, М. Поўны збор твораў : у 3 т. / М. Багдановіч / Акад. навук Беларусі. Ін-т літаратуры імя Я. Купалы ; рэдкал.: В.В. Зуёнак [і інш.]. – Мінск : Навука і тэхніка, 1992–1995. – Т. 2. – 599 с.
3 Гесэ, Г. Гульня шкляных перлаў: Спроба жыццёпісу Магістра Гульні Ёзэфа Кнэхта з дадаткам ягоных твораў : раман / Г. Гесэ ; пер. з ням. В. Сёмухі. – Мінск : Маст. літ., 1991. – 476 с.
4 Гете, И.В. Собр. соч. : в 10 т. – Т. 2 : Фауст / И.В. Гете. – М. : Худ. лит., 1976. – 509 с.
5 Зинченко, В.Г. Методы изучения литературы. Системный подход / В.Г. Зиченко, В.Г. Зусман, З.И. Кирнозе. – М. : Наука, 2002. – 200 с.
6 Концепция развития системы педагогического образования в Республике Беларусь : проект / П.Д. Кухарчик [и др.] ; под общ. ред. И.И. Цыркуна. – Минск : БГПУ, 2008. – 32 с.
7 Системный анализ и принятие решений : словарь-справочник. – М. : Высш. школа, 2004. – 616 с.
8 Тимофеев, Л.И. Основы теории литературы : учеб. пособие / Л.И.Тимофеев. – М. : Просвещение, 1976. – 448 с.

*Белая А.І.*

## АНТРАПАЛАГІЧНА АРЫЕНТАВАНЫЯ ВЕДЫ І ПРАБЛЕМА ІНТЭРПРЭТАЦЫІ МАСТАЦКАГА ТВОРА

Інтэрпрэтацыя – шырокая і разгорнутая ацэначная з'ява. У адрозненне ад непасрэдна ацэнкі яна мае сістэмны і шматмерны характар і выступае як працэс выяўлення максімальнай колькасці сувязей і суадносін аднаго аб'екту ацэнкі з другім. У фармаце дадзенага артыкула мы разгледзім у якасці такога аб'екта асабовую праблематыку ў прозе першай трэці XX стагоддзя. Да мастацкай літаратуры ў поўнай меры стасуюцца словы А. Прудона аб тым, што мастацтва не выключае навукі, а асуджана дапасоўвацца да яе па меры свайго развіцця, якое адбываецца хутчэй. Мастацтва папярэджвае навуку ў сваім росквіце, апераджае яе ў выніках, дае прадчуваць яе ў сваім натхненні, "а часам, у эпохі невуцтва… нават замяняе яе…" [2, с. 3]. Аналіз нацыянальнай класікі мяжы XIX і XX стагоддзяў яшчэ раз пераконвае ў слушнасці думкі Р. Барта, што свет літаратурнага твора ўсеабдымны і ахоплівае разнастайныя віды ведаў: сацыяльныя, псіхалагічныя, гістарычныя, – а "ўсе сённяшнія адкрыцці гуманітарных навук… былі вядомыя літаратуры заўсёды, розніца толькі ў тым, што яны ў ёй не гаварыліся, а пісаліся" [2, с. 3].

Метадалогія вывучэння чалавека – гэта сістэма філасофскіх, сацыялагічных і прыватнанавуковых метадаў. У антрапалагічна



Рэпазіторый БарДУ

арыентаваных навуках асоба прадстаўлена трыма базавымі кампанентамі: як прыродная з'ява (індывід); як сацыяльная з'ява з усімі яе сацыяльнымі сувязямі (уласна асоба); як касмічная з'ява (універсум).

Робячыся аб'ектам інтэрпрэтацыі, паняцце "асоба" пэўным чынам дыферэнцыруецца ад больш шырокага паняцця "чалавек", робіцца каштоўнаснай катэгорыяй і вымярае годнасць чалавека ступенню самастойнасці яго мыслення і дзеяння, мерай ажыццёўленага ў ім самабыцця, з аднаго боку, і мерай паўнаты маральнай адказнасці, з другога [3, с. 223].

Мы прымаем азначэнне асобы, дадзенае ў гуманістычнай псіхалогіі, – як "агульнай ідэі індывідуальных адрозненняў… як працэсу развіцця на працягу жыцця, а таксама як сутнасці, якая тлумачыць стабільныя формы паводзін" [10, с. 51]. Менавіта гэтую якасць асобы акцэнтуе і М. Бярдзяеў. Паводле яго вызначэння, "асоба ёсць нязменнае ў зменах" [2, с. 4], а гэта надзвычай істотная якасць быцця чалавека ў зменлівым, "перакуленым" свеце. Рускі філосаф лічыў, што эпохі, надзвычай напоўненыя падзеямі і зменамі, прынята лічыць цікавымі і значнымі для гісторыі, але гэтыя ж эпохі няшчасныя і пакутніцкія для асобных людзей і цэлых пакаленняў.

Б. Мікуліч у адным з рускамоўных фрагментаў "Аповесці для сябе" пісаў: "…Обострение интереса в человеке к вопросам философии и политики обнаруживается как раз не тогда, когда человек благодушествует, а тогда, когда жизненные неудобства обступают его со всех сторон. В полосы счастливого, спокойного, беспечного благодушия человека тянет к поэзии, к искусству: острые вопросы философии, истории, политики притягивают в моменты "критические", в моменты душевного неравновесия" [7, с. 77]. Менавіта на такія моманты была багатай першая трэць XX стагоддзя. Гістарычныя веды дазваляюць усвядоміць, чаму ў беларускай прозе гэтага перыяду больш тыпаў, чым характараў. На думку К. Чукоўскага, тыповасць асобных людзей адрынута, таму што "ў крызісныя часы яе замяняе тыповасць агульначалавечага лёсу" [11, с. 201]. Між тым, паняцце "крызіс" тлумачыцца не толькі як "праблема", а і як "магчымасць". Менавіта ўсведамленне нетрываласці звыклага пабуджае чалавека да пошуку нечага іншага. Чым дысгарманічней быццё, тым настойлівей чалавек імкнецца да гармоніі (набыцця самасці, самаажыццяўлення, самаактуалізацыі). А паколькі такое імкненне далёка не ўсеагульнае, то менавіта яго наяўнасць выступае якасным паказчыкам чалавечай асобы, своеасаблівым "чалавечым знакам" (А. Вярцінскі). З такіх пазіцый, напрыклад, інтэрпрэтуецца вобраз купалаўскага Сама Я. Гарадніцкім у яго працы "Паэтыка беларускай прозы XX стагоддзя: суб'ектна-аб'ектныя суадносіны". Увогуле ***сам, самавіты, сам у сабе хлопец*** – беларускія

Рэпазіторый БарДУ

характарыстыкі вызначальных асабовых якасцей, і разам з тым, адмысловыя адменікі паняццяў, якімі аперыруе псіхалогія.

Аб'ектыўнае даследаванне канцэпцыі асобы на пэўным літаратурным матэрыяле заўсёды кіруецца гісторыка-філасофскімі падыходамі. Заўважана, што цікавасць да ідэй антрапалагічнай філасофіі, супадаюць з перыядамі актывізацыі ў літаратуры ідэі чалавека. Асабліва актыўна звяртаюцца гуманітарныя навукі да даследавання загадак чалавечага "я" ў часы сацыяльных трансфармацый і выкарыстоўваюць дыялог як ключ да іх.

Нездарма складальнікі акадэмічнай "Гісторыі беларускай літаратуры" на рубяжы XX і XXI стагоддзяў адзначылі: "Для больш рашучага перагляду важнейшых праблем развіцця нацыянальнай літаратуры беларускаму літаратуразнаўству не хапае сучаснага філасофска-тэарэтычнага патэнцыялу, які назапашваецца гадамі і дзесяцігоддзямі" [5, с. 10]. Беларусы спрадвеку цанілі філасофскі розум, пра што сведчыць наяўнасць у нашай культурнай прасторы такіх герояў (гераінь), як разумная дачка, "філасофская баба" Мар'я у У. Галубка, шматлікія Зосі-Соф'і…

Стаўленне ж да філасофскіх ведаў у часы вульгарызацыі надзвычай удала перадаў Ц. Гартны ў рамане "Сокі цаліны". Рыгор Нязвычны, едучы ў трамваі, аналізуе рэакцыю людзей на пераломныя падзеі ў вайне 1914 года і канстатуе: "Калі б буржуазная філасофія не была пустою рэччу, патрэбна было б ужыць яе пры вывучэнні змешчанай у трамваі кучкі людзей" [12, с. 151].

Праблема аналізу і інтэрпрэтацыі мастацкага тэксту на філасофска-эстэтычным узроўні павінна вырашацца з далучэннем у неабходнай меры набыткаў псіхалагічнай навукі (трактоўка прыроды і сутнасці чалавека, уласцівая дадзенай гісторыка-культурнай эпосе), на жанравым узроўні (жанравая спецыфіка ўзнаўлення цэласнага быцця чалавека ў празаічным творы), на ўласна мастацкім узроўні (чалавек у мастацкім свеце пісьменніка). З усведамленнем гэтага А. Бабарэка пісаў: "А чалавек гэты не пустая фігурка з слоў, а жывое ўяўленне праўды беларускай рэчаіснасці. Гэта тое, дзе пачынаюцца карэнні адменнай філасофіі" [8, с. 569]. Творы айчыннай літаратуры ў яе лепшых набытках пераконваюць у тым, што беларускі мужык – такая ж "шматпавярховая" асоба з разнастайнасцю пачуццяў і складанасцю станаў, якія перададзены ў адмысловых мастацкіх вобразах і маўленні герояў.

Акрэслены намі перыяд праз шэраг аб'ектыўных прычын не даў значных айчынных эстэтыка-філасофскіх і псіхалагічных даследаванняў у галіне асобы. Адносна беларускіх празаікаў справядліва тое, што яны ў большасці сваёй не мелі сістэматычнай адукацыі, былі дастаткова далёкімі

ад авангардных плыняў пачатку стагоддзя, некрытычнага пераймання модных эстэтычных і філасофскіх сістэм, сацыяльных тэорый. Аднак, не ставячы мэты стварэння ўласнай філасофскай сістэмы, пісьменнік асэнсоўвае ўсе пытанні перш за ўсё як мастак. Вылучэнне з літаратурнага твора фрагментаў тэксту, якія ўтрымліваюць у сабе непасрэдныя філасофскія і іншыя навуковыя палажэнні, увогуле лічыцца заганай інтэрпрэтацыі. Таму звяртаемся да канцэптуальных пазіцый, па-мастацку акрэсленых і сфармуляваных беларускімі пісьменнікамі з улікам асаблівасцей гістарычнага шляху беларусаў, іх мыслення і маўлення. А. Бабарэка пісаў: "...адзін нямецкі філосаф казаў, што ў "філасофскіх разважаннях дзіўным чынам выходзіць... менавіта толькі тое, што хто-небудзь толькі для сябе перадумаў і даследаваў, бывае потым прыгодным і іншым, а не тое, што з самага пачатку прызначалася для іншых", так бывае і з чэсным мастацтвам" [8, с. 569–570]. Гэта якраз і азначае, што сапраўдны мастак, успрымаючы сучаснасць праз яе цесную сувязь з мінулым, мог і самастойна прыйсці да пэўнай філасофскай ці гістарычнай канцэпцыі. Так, аналіз мастацкай канцэпцыі асобы ў беларускай прозе яскрава выяўляе адметнасць беларускай экзістэнцыі: "трэба жыць; трэба варушыцца; трэба пачынаць усё спачатку". Трэба "глядзець характва ў зробленай працы". "На чым сядзіш, таго глядзі ты". "Не можаш мець, што любіш, любі, што маеш" і да т. п.

Адметным чынам у беларускай экзістэнцыі спалучаюцца memento mori і memento vivere. Перадусім, канечне, у трагічным плане. Маці Сёмкі Загона ("Сокі цаліны") "горнілася" пры думках аб заўчаснай смерці ў бежанстве мужа Хведара і Стэпы Нязвычнай, а нявестка Волька страшнымі ў сваёй аголенай праўдзівасці словамі суцяшала: "Кіньце, маці... Вось яны памерлі – то спакайнейшымі будуць. Ці не лепш... чым валачыцца па гэтым свеце? ...На ліха казана гэта жыццё ў наш час..." [4, с. 372–373]. Але нават такія з'явы, як вайна і смерць, часам асвойваюцца беларускімі пісьменнікамі ў адпаведнасці з ментальнымі характарыстыкамі беларусаў, у формах гумарыстычнага дыскурсу (К. Крапіва. Л. Калюга). І гэта таксама мае пад сабою філасофскі грунт.

У расійскім літаратуразнаўстве існуе азначэнне перыяду "траістай вайны" як "эпохі рубяжа". Ёсць падставы рассунуць яе межы на ўсю першую трэць XX стагоддзя, кіруючыся меркаваннем О. Шпенглера, які ў працы "Закат Европы" сцвярджаў: "значэнне слова "эпоха" зараз змешваецца з сэнсам паняцця "перыяд". Першапачатковы ж сэнс гэтага слова... прыпынак, затрымка, спыненне" [12, с. 309]. Паводле гістарычнага маштабу, першая трэць XX ст. – гэта "Вялікі Час"; вайна ў яе ўплыве на чалавека – "Вялікая Псота" (М. Тычына); калектывізацыя – Вялікі Пералом. Падзея робіць эпоху: яна азначае ў развіцці культуры



Рэпазіторый БарДУ

нейкую неабходную, фатальную змену. Гэтая фатальная змена ўжо традыцыйна абазначаецца ў нашай літаратуры метафарай "сцюжа". Але ёсць іншая, не менш яскравая – "суш у душы", у чым небеспадстаўна папракае героя̄ў рамана К. Чорнага "Сястра" Маня Ірмалевіч, і гэта, безумоўна, не адзіны прыклад. А гумар азначае "вільгаць" і шчодра жывіць беларускую глебу, разнастайна адлюстраваную ў літаратуры "эпохі рубяжа". Гумар сведчыць аб чалавечай годнасці, сцвярджае перавагу чалавека над абставінамі. У большасці выпадкаў ён звернуты героямі супраць агульнай долі, якую чалавек падзяляе з усімі людзьмі.

Усцешна, што сёння літаратуразнаўства і філасофія выяўляюць узаемную цікавасць. "Філасофскія разважанні павінны выкарыстоўваць… вобразныя прыклады, аналогіі, вершы, цытаты з мастацкіх твораў… даючы не толькі зразумець, але таксама ўспрыняць і адчуць тое, што называецца філасофіяй у яе глыбінным сэнсе" [1, с. 12].

Каб даць адэкватную філасофскую інтэрпрэтацыю аналізуемаму твору, патрэбна "філалогія, якая філасофствуе" – валодае здольнасцю за мудрагелістымі стылістычнымі фігурамі, тропамі і моўнымі сімваламі разгледзець абрысы філасофскіх поглядаў [9]. У сучаснай філасофіі з'явіліся спробы канструявання спецыфічнага "філалагічнага вобраза свету", ці карціны свету з "філалагічным ухілам" [13, с. 49]. Прыватны, аднак, вельмі паказальны прыклад – экзістэнцыйная метафара. Тыпалагічнае параўнанне эстэтычных з'яў розных літаратур сведчыць, што многія культурныя феномены "…траплялі ў поле зроку філасофскай рэфлексіі (прычым у самых розных яе варыянтах) і знаходзілі падобныя інтэрпрэтацыі… таму, што самі гэтыя феномены рабіліся дастаткова магутнымі для таго, каб дыктаваць сваю волю праз супадзенне вытлумачэнняў аж да метафар" [6]. Думаецца, тут сваю ролю адыгрываюць гуманістычны светапогляд творцаў і іх мастацкая інтуіцыя. Гэта датычыць распаўсюджаных у паэтыцы беларускай літаратуры метафар шляху, плыні, агню, хваробы і інш. Так, паводле Ж. Дэрыда, "…сцежкі – яшчэ не праверанын шляхі, ды і азначаны яны надзвычай схематычна, калі толькі пясок не паспеў засыпаць (і тым самым абазначыць) іх. Аднак ці не з'яўляецца нерасчышчаны шлях таксама і ўмовай *рашэння* ці *падзеі* (курсіў аўтара – А. Б.), якія заключаюцца ў адкрыцці шляху, у яго (пера)ходзе і, такім чынам, *у выхадзе за яго межы*?" [6, с. 222]. Аналіз жыццёвых перыпетый героя̄ў рамана М. Зарэцкага "Сцежкі-дарожкі" ўпэўнівае ў мэтазгоднасці вызначаных асацыятыўна-сімвалічных сувязей. Асноўнае палажэнне бубераўскай філасофіі дыялогу адбілася ў рэфлексіях А. Бабарэкі: "Чалавек – гэта тое, чым *бывае* (курсіў аўтара – А. Б.) чалавек для чалавека" [8, с. 570], у загалоўку і змесце паэмы Я. Купалы "Яна і я" і інш.



Рэпазіторый БарДУ

Такім чынам, інтэрпрэтацыя – гэта аб'ектывізацыя і абгрунтаванне ацэнкі, якая патрабуе аналізу ацэньваемага аб'екта ва ўсёй паўнаце яго сувязей, суадносін, значнасці. Мастацкая форма прэзентацыі ведаў пра свет і чалавека заўжды рабіла іх больш прывабнымі, чым мова тэрмінаў. Сучасная тэарэтычная думка жывіцца не толькі навуковымі канструктамі, а і мастацка-вобразнымі мадэлямі рэчаіснасці. Ідэі філасофскай антрапалогіі і гуманістычнай псіхалогіі істотна паўплывалі на фарміраванне сістэмы поглядаў беларускіх празаікаў на асобу і якасць мастацкай укаранёнасці гэтых ідэй у іх творах. Поспех інтэрпрэтацыі мастацкага твора палягае ў яго даследаванні на сумежжы шэрагу гуманітарных навук сродкамі параўнальнага літаратуразнаўства, якое грунтуецца на супастаўленні літаратуры з іншымі выяўленчымі формамі і галінамі ведаў.

СПІС ЛІТАРАТУРЫ

1 Арсеньев, А.С. Философские основания психологии личности : дис. в виде научного доклад … д-ра психол. наук / А.С. Арсеньев. – М., 2001. – 38 с.

2 Белая, А.І Чалавек у плыні часу: мастацкая канцэпцыя асобы і тыпалогія характараў у беларускай прозе першай трэці XX стагоддзя : манаграфія / А.І. Белая. – Баранавічы : РВА БарДУ, 2009. – 408 с.

3 Бронская, Л.И. Концепция личности в автобиографической прозе русского зарубежья: И.С. Шмелёв, Б.К. Зайцев, М.А. Осоргин : дис. … д-ра филол. наук: 10. 01. 01. – русская литература / Л.И. Бронская. – Ставрополь, 2001. – 371 л.

4 Гартны, Ц. Сокі цаліны : Раман у чатырох квадрах / Ц. Гартны. – Т. 2. – Мінск : Дзярж. выд-ва БССР, 1958. – 522 с.

5 Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя : у 4 т. – Т. 1. 1901–1920 / НАН Беларусі, Аддз-не гуманіт. навук і мастацтваў, Ін-т літаратуры імя Я. Купалы. – 3-е выд. – Мінск : Беларус. навука, 2003. – 583 с.

6 Гурко, Е. Деконструкция: тексты и интерпретация. Деррида, Ж. Оставь это имя (Постскриптум), Как избежать разговора: денегации. – Минск : Экономпресс, 2001. – 320 с.

7 Мікуліч, Б. Аповесць для сябе / Б. Мікуліч. – Мінск : Маст. літ., 1993. – 238 с.

8 Расстраляная літаратура: творы беларускіх пісьменнікаў, загубленых карнымі органамі бальшавіцкай улады / уклад.: Л. Савік, М. Скоблы, К. Цвіркі ; прадм. А. Сідарэвіча ; камент. М. Скоблы, К. Цвіркі. – Мінск : Кнігазбор, 2008. – 696 с.

9 Слемнёва, И.М. Роль филологии в оформлении и развитии философского знания / И.М. Слемнёва // Философия как самопонимание культуры и посредник в диалоге культур : материалы междунар. науч. конф., 9-10 ноября 2006 г., Минск / НАН Беларуси ; науч. ред.: В.Н. Новиков [и др.]. – Минск, 2006. – С. 314–317.

10 Хьелл, Л. Теории личности / Л. Хьелл, Д. Зиглер. – 2-е изд. – СПб. : Питер, 2005. – 607 с.

11 Чуковский, К. Современники: Портреты и этюды / К. Чуковский. – Минск : Нар. асвета, 1985. – 575 с.

Репозиторий БарГУ

12 Шпенглер, О. Закат Европы. Очерки морфологии мировой истории. 1. Гештальт и действительность / Пер. с нем., вступ. ст. и примеч. К.А. Свасьяна. – М. : Мысль, 1993. – 663 с.
13 Щукин, В.Г. О филологическом образе мира / В.Г. Щукин // Вопросы философии. – 2004. – № 10.

*Борсук Н.Н.*

## РОЛЬ ЛИТЕРАТУРЫ В АДАПТАЦИИ ТУРКМЕНСКИХ СЛУШАТЕЛЕЙ

Эффективность обучения зависит не только и не столько от профессионализма преподавателя, сколько от личностного потенциала обучаемого, а также от потребностей общества в той или иной модели специалиста. В античной Греции и Риме ценили память. В эпоху Просвещения памяти был противопоставлен культ мышления. В настоящее время в моде смс-телеграфный стиль общения. Для половины студентов, иррациональных и инфантильных, обучение заключается не в овладении определённой специальностью, а в получении диплома о высшем образовании как показателе социальной значимости.

Студент-иностранец обладает не только вышеперечисленными качествами молодого человека, но и, попадая в новую социальную и образовательную сферы, в чужую культуру, вдали от родных людей, он скучает по дому, испытывает стресс, депрессию, затруднения при адаптации к условиям обучения и проживания в стране, к новым условиям жизни, включая биологический и физиологический факторы и т. д.

Образовательный обмен студентами вот уже четвёртый год широко практикуется в Брестском государственном техническом университете. В нём обучаются (данные на март 2011 года) 168 граждан из Нигерии, Ирана, Германии, Польши, Китая, Азербайджана, Туркменистана, Турции, Сирии, Украины. Особое место занимает международное сотрудничество с Китаем. Подписание договора между БрГТУ и техническим институтом Хух-Хота даёт основание прогнозировать рост бикультурного сотрудничества в сфере образования. Безусловно, интернационализация образования ставит новые задачи для создания комфортных и эффективных условий организации учебного процесса. Помочь иностранному студенту приспособиться к новым социальным нормам и преодолеть факторы, препятствующие адаптации: психологической, языковой, культурной, образовательной, организационной и т. д., – важная задача, которая стоит перед преподавателями РКИ и воспитателями.

Предметы гуманитарного цикла, в частности, факультатив по литературе для иностранных слушателей подготовительного отделения

Репозиторий БарГУ